Настаўніцкая газета
№ 128 (8624), 18 лістапада 2021 года

# Поспех там,

Для ўдзелу ў цэнтралізаваным тэсціраванні па беларускай мове ў 2021 годзе зарэгістраваліся 17 889 чалавек. Здавалі экзамен з улікам двух рэзервовых дзён 17 189 чалавек.
Максімальна магчымы бал (100) атрымаў 41 абітурыент.
Не пераадолелі парогавага значэння тэставага бала (10) па беларускай мове, установленага Міністэрствам адукацыі, 1,15% абітурыентаў ад агульнай колькасці ўдзельнікаў тэсціравання. Асноўную частку тых абітурыентаў, хто атрымаў менш за 10 балаў, па-ранейшаму складаюць выпускнікі мінулых гадоў. Чатыры абітурыенты паказалі нулявы вынік. Адзін з іх здаў бланк, запоўніўшы ўсе клетачкі (150) у частцы А і не даўшы ніводнага адказу ў частцы В. Тры ўдзельнікі тэсціравання запоўнілі бланкі па выбраных імі малюнках-схемах.
З кожным годам свой сярэдні бал павышаюць выпускнікі школ. Складаным тэст па-ранейшаму застаецца для выпускнікоў УССА і найбольш — УПТА. Захоўваецца і асноўная прычына нізкіх сярэдніх балаў указанай катэгорыі абітурыентаў. Многія з іх у працэсе навучання засяроджаны на атрыманні прафесійных навыкаў. Аднак тым навучэнцам, хто хоча паступіць ва ўстановы вышэйшай адукацыі, трэба клапаціцца пра засваенне агульнаадукацыйных прадметаў на ўзроўні, раўнацэнным школьнаму, і падтрымліваць неабходныя веды ў актуальным стане.

## Фанетыка і арфаэпія

Веданне фанетыка-арфаэпічных законаў правяралася ў тэсце з дапамогай задання на ўстанаўленне адпаведнасці. Разгледзім канкрэтны прыклад.

**В8.** Устанавіце адпаведнасць паміж словамі ў левым слупку табліцы і іх фанетыка-арфаэпічнымі характарыстыкамі ў правым слупку. Адказ запішыце ў выглядзе спалучэння літар і лічбаў, захоўваючы алфавітную паслядоўнасць літар левага слупка. Памятайце, што некаторыя даныя правага слупка могуць не выкарыстоўвацца ўвогуле. Напрыклад: А2Б5В3Г4.

| | |
|---|---|
| **А.** Расчуліцца. | **1.** Слова, у якім ёсць зычны гук ***[д]***. |
| **Б.** Падземны. | **2.** Слова, у якім ёсць зычны гук ***[дж]***. |
| **В.** Агароджа. | **3.** Слова, у якім ёсць зычны гук ***[ш]***. |
| **Г.** Кладка. | **4.** Слова, у якім ёсць зычны гук ***[т]***. |
| | **5.** Слова, у якім ёсць зычны гук ***[с]***. |

Правільны адказ на прыведзенае заданне — **А3Б1В2Г4**. Яго дала большасць тых паступаючых, хто выконваў 5-ы варыянт тэста.

Другі па папулярнасці адказ — А5Б1В2Г4. Абітурыенты памылкова адзначылі гук [*с*] у слове *расчуліцца*. У адпаведнасці з нормай вымаўляем [*ра**ш**чу́л’іцца*].

З аднаго боку, парушэнне гэтай арфаэпічнай нормы значнай колькасцю паступаючых абумоўлена слабым засваеннем імі правіл вымаўлення свісцячых зычных гукаў у становішчы перад шыпячымі. Вывад відавочны: падчас навучання неабходна больш увагі ўдзяляць маўленчым нормам літаратурнай мовы.

З другога боку, калі выбіраць з двух варыянтаў вымаўлення слоў тыпу *расчарціць*, *расчыніць*, *счарнець*, *расчырванецца*, то вымавіць іх лягчэй правільна ([*ра**ш**чарц’і́ц’*], [*ра**ш**чын’і́ц’*], [***ш**чарн’э́ц’*], [*ра**ш**чырван’э́цца*]), чым няправільна ([*ра**с**чарц’і́ц’*], [*ра**с**чын’і́ц’*], [***с**чарн’э́ц’*], [*ра**с**чырван’э́цца*]).

І ўсё ж найбольш складаным для разумення з’яўляюцца арфаэпічныя памылкі, дапушчаныя шматлікімі паступаючымі ў прыкладах тыпу *падземны*, *адзвінець*, *адзначыць*, *адзімаваць*. У прыведзеных словах абітурыенты адзначылі глухія зычныя гукі [*т*] і [*с*]. Цяжка ўявіць, быццам нехта з іх вымавіў, напрыклад, слова *падземны* такім чынам: [*патсэмны*]. Аднак няцяжка здагадацца, наколькі важна клапаціцца пра павышэнне агульнай маўленчай культуры, пра ўдасканаленне навыкаў валодання нормамі вуснага маўлення, пра сур’ёзнае стаўленне да экзамену.

## Арфаграфія

У групу найбольш складаных для выканання трапіла заданне А7 на праверку ведання тэмы «Вымаўленне і правапіс звонкіх зычных гукаў, спалучэнняў зычных». Тэма, бясспрэчна, не самая простая і пры адсутнасці павышанай увагі да яе ў працэсе навучання не можа быць якасна засвоена.

Калі гаварыць пра абітурыентаў 2021 года, то асноўная іх частка не асэнсавала дзвюх моўных з’яў з абазначанай тэмы: 1) гістарычныя спалучэнні зычных гукаў [*здн*], [*рдн*], [*стн*], [*рдц*] у сучаснай беларускай мове не перадаюцца ні пры вымаўленні, ні на пісьме. Прыкладна 37% паступаючых пазначылі як правільна напісаныя словы тыпу *поздні*, *міласэрдны*, *капустны* (трэба: *позні*, *міласэрны*, *капусны*); 2) у прыметніках, утвораных ад назоўнікаў з асновай на [*т*] пры дапамозе суфікса *-ск-*, спалучэнне *тс* перадаецца праз *ц*. Каля 32% паступаючых пагадзіліся з напісаннямі накшталт *студэнтскі*, *кандыдатскі*, *факультэтскі*, *братскі* (трэба: *студэнцкі*, *кандыдацкі*, *факультэцкі*, *брацкі*). Не скідваем з рахунку, зразумела, і ўплыву рускай мовы на напісанне падобных слоў. Параўнайце ў рускай мове: *поздний*, *милосердный*, *кандидатский*, *факультетский* і г. д.

Звярнуўшыся да вынікаў выканання астатніх 6 заданняў па арфаграфіі, адмаркіруем правілы, на якія была дапушчана найбольшая колькасць памылак, і пазначым у дужках працэнт няправільных адказаў: А1 — напісанне з вялікай літары назоўнікаў, якія абазначаюць назвы літаратурных твораў, тыпу *п’еса «**К**ім», драма «**П**арог»* (9%); А2 — напісанне літары *а* ў словах іншамоўнага паходжання, якія маюць фіналь *-ар*, тыпу *менедж**а**р* (24%); А3 — напісанне літары *е* ў словах іншамоўнага паходжання тыпу *л**е**генда* (32%); А4 — напісанне ў (*нескладовага*) пасля злучка, калі папярэдняе слова заканчваецца на галосны, тыпу *ручка-**ў**казка* (37%); А5 — напісанне без *апострафа* слоў тыпу *здаро**ўе***, бо пасля ў (*нескладовага*) перад літарамі *е, ё, ю, я, і* апостраф не пішацца (39%); А6 — напісанне дзвюх аднолькавых літар на стыку прыстаўкі і кораня ў словах тыпу *бя**сс**ледны* (37%).

## Лексіка. Фразеалогія

Веданне паронімаў і правільнае ўжыванне іх у маўленні, разуменне з’яў, якія могуць імі абазначацца, дазволіла 81% абітурыентаў дакладна выканаць тэставае заданне В7.

На аснове двух прыкладаў разгледзім словы-паронімы, індывідуальнага значэння якіх не ведала хоць і меншасць, але даволі значная частка паступаючых.

**В7**. З двух прапанаваных у дужках слоў вызначце тое, што адпавядае сэнсу сказа. Запішыце гэта слова ў той граматычнай форме, у якой яно прапанавана:

*Сваю (пісьменную, пісьменніцкую) дзейнасць Кандрат Крапіва пачынаў як лірык, а сатыру лічыў чымсьці несур’ёзным, аднак з часам адкрыўся талент «пякучкі-крапівы» — і свет убачылі цудоўныя байкі, камедыі, артыкулы.*

***Адказ: пісьменніцкую.***

Па прычыне няведання ці толькі прыблізнага ведання лексічнага значэння слоў *пісьменны* (*які ўмее чытаць і пісаць*) і *пісьменніцкі* (*які мае адносіны да пісьменніка*) 555 абітурыентаў з 1712, якія выконвалі 2-і варыянт тэста, няправільна злучылі словы *дзейнасць* і *пісьменную* і, як вынік, не пабудавалі выказвання.

**В7**. З двух прапанаваных у дужках слоў вызначце тое, што адпавядае сэнсу сказа. Запішыце гэта слова ў той граматычнай форме, у якой яно прапанавана:

*(Масціты, масцісты) кампазітар Станіслаў Манюшка, якога ў музычным мастацтве лічаць рамантыкам, нярэдка ў сваёй творчасці звяртаўся да тэкстаў Яна Чачота, Уладзіміра Сыракомлі, Яна Карловіча — знаўцаў і папулярызатараў беларускага фальклору.*

***Адказ: масціты.***

Нечаканае, нават крыху камічнае, спалучэнне слова *масцісты* (*чыстай, добрай масці*) са словам *кампазітар* атрымалася ў 619 паступаючых з тых 1712, хто пісаў 9-ы варыянт.

Аналізуючы заданні часткі В тэста, даводзіцца канстатаваць, што пэўная група паступаючых, ідэнтыфікаваўшы неабходную лексічную адзінку, у выніку не дала правільнага адказу, бо дапусціла памылкі пры запісе слова. Так, дакладна знайшоўшы паронім-прыметнік *адукаваны*, які трэба было перанесці ў бланк адказаў, не мяняючы формы, некаторыя абітурыенты запісалі яго наступным чынам: *адукованы, адукованны, адукаванны* і інш.

Ступень пранікнення ў фразеалагічную сістэму, маўленчы густ абітурыентаў праяраўся матэрыялам задання В9. Чым абумоўлены недакладныя адказы даволі значнай часткі паступаючых, вызначым на прыкладзе з 8-га варыянта тэста.

**В9**. Устанавіце адпаведнасць паміж фразеалагізмамі ў левым слупку табліцы і ***супрацьлеглымі*** ім па значэнні фразеалагізмамі ў правым слупку. Адказ запішыце ў выглядзе спалучэння літар і лічбаў, захоўваючы алфавітную паслядоўнасць літар левага слупка. Памятайце, што некаторыя даныя правага слупка могуць не выкарыстоўвацца ўвогуле. Напрыклад: А2Б5В3Г4.

| | |
|---|---|
| **А.** Задаваць тон. | **1.** Душа спявае. |
| **Б.** Абы з рук. | **2.** Іграць другую скрыпку. |
| **В.** Сэрца ные. | **3.** Даваць маху. |
| **Г.** Журавель у небе. | **4.** Сініца ў руцэ. |
| | **5.** З агеньком. |

Правільны адказ на прыведзенае заданне — **А2Б5В1Г4**. Аднак 520 чалавек з тых 1683 абітурыентаў, хто выконваў названы варыянт, далі адказ А2Б3В1Г4. Тут відавочныя, як мінімум, дзве прычыны няправільных адказаў.

Па-першае, паступаючыя маглі не ведаць значэння трох фразеалагізмаў: *абы з рук* (*без ахвоты і старання працаваць*), *даваць маху* (*дапускаць памылку, памыляцца*), *з агеньком* (*працаваць старанна, з вялікім уздымам*). Па-другое, калі ўлічыць адказ Б3, пэўная частка падыспытных вызначала фразеалагізмы не з супрацьлеглым значэннем, а фразеалагізмы-сінонімы. Безумоўна, агучаныя дзве прычыны памылак не адзіныя, але найбольш яўныя.

## Марфемная будова слова. Словаўтварэнне

У заданні па марфеміцы паступаючым трэба было ідэнтыфікаваць словы з суфіксам *-н-*. Якія непажаданыя, але рэальныя памылкі былі дапушчаны імі, высветлім на аснове прыкладу з 9-га варыянта тэста (выконвалі 1712 чалавек). Колькасць адказаў у працэнтных адносінах пазначым насупраць кожнай опцыі.

**А8.** Адзначце словы з суфіксам ***-н-***:
1) ільняны (19,33);
2) шырыня (28,33);
3) курганны (89,84);
4) ахаладжэнне (44,98);
5) выкарыстаны (45,74).

***Адказ: 3,5.***

Каб зрабіць марфемны аналіз прапанаваных у заданні слоў, патрэбны: навык вызначэння суфіксаў шляхам супастаўлення слоў з роднаснымі і аднолькавымі па структуры; веданне спосабаў утварэння прыметнікаў пры дапамозе суфіксаў *-ан-, -ян-, -ін-, -ын-, -н-*; веданне спосабу ўтварэння назоўнікаў пры дапамозе суфіксаў *-енн-, -энн-*; веданне спосабу ўтварэння дзеепрыметнікаў залежнага стану прошлага часу пры дапамозе суфікса *-н-*.

Больш за ўсё пытанняў выклікалі ў абітурыентаў назоўнікі з суфіксамі *-енн-* ці *-энн-* і дзеепрыметнікі. Прыкладна 47% удзельнікаў ЦТ не падабралі да назоўнікаў накшталт *ахаладжэнне, аздабленне, ацяпленне* аднакаранёвых слоў (*ахаладзіць, холад; аздобіць, аздоба; ацяпліць, цяпло* і інш.), не ведалі спосабу іх утварэння і дапусцілі марфемную памылку — выдзелілі суфікс *-н-*. Каля паловы (49%) паступаючых не суаднеслі дзеепрыметнікаў залежнага стану прошлага часу тыпу *выкарыстаны, падтрыманы, даказаны* з аднакаранёвымі словамі (*выкарыстаць; падтрымаць, падтрымка; даказаць, доказ*), не засвоілі спосабу ўтварэння гэтай дзеяслоўнай формы і не адзначылі ў іх суфікса *-н-*.

Для словаўтваральнага аналізу ўдзельнікам тэсціравання прапаноўваліся назоўнікі, прыметнікі і займеннікі (прыслоўі) з постфіксам *-небудзь*. Самая багатая ў словаўтваральных адносінах часціна мовы, як вядома, назоўнік. У заданні былі задзейнічаны дзве мадэлі яго ўтварэння: аддзеяслоўныя назоўнікі мужчынскага роду, утвораныя бяссуфіксным спосабам, і адпрыметнікавыя назоўнікі, утвораныя суфіксальным спосабам. Не ўсе абітурыенты адчувалі сябе ўпэўнена, вызначаючы бяссуфіксны спосаб утварэння назоўнікаў. У кожным варыянце тэста мінімум 200 чалавек памылкова пазначылі, што аддзеяслоўныя назоўнікі тыпу *падзел*, *наказ*, *вылет*, *прыезд* утвораны прыставачным спосабам.

Рэальныя цяжкасці ў паступаючых выклікала другая мадэль — прыметнікі, утвораныя прыставачна-суфіксальным спосабам. Скажам, больш за 400 абітурыентаў, якія выконвалі 5-ы варыянт тэста (1727 чалавек), прыметнік *бязлесны*, утвораны ад назоўніка *лес* пры дапамозе прыстаўкі *бяз-* і суфікса *-н-*, аднеслі да слоў, утвораных прыставачным спосабам.

Аналізуючы адказы як сёлетніх, так і абітурыентаў мінулых гадоў, заўважаем: значная колькасць з іх праводзіць не словаўтваральны, а марфемны аналіз лексічных адзінак.

## Марфалогія і арфаграфія

Не засвоілі напісання складаных назоўнікаў (заданне А9) дзесьці 42% выпускнікоў школ, каля 23% — выпускнікоў гімназій і ліцэяў, абсалютная большасць выпускнікоў УССА, УПТА і мінулых гадоў. Да 30% удзельнікаў тэсціравання сёлета дапускалі памылкі на правапіс праз злучок уласных назоўнікаў са скарочанай пачатковай часткай *паў-*, састаўных прозвішчаў і назоўнікаў, утвораных з дзвюх асноў без злучальнай галоснай: *паў-Даніі, паў-Антарктыды; Дунін-Марцінкевіч, Неміровіч-Данчанка; асістэнт-стажор, аспірант-завочнік* і пад. Каля 10% паступаючых не вызначыліся з напісаннем разам назоўнікаў з першымі іншамоўнымі часткамі тыпу *інфра-, авія-, гідра-, мота-* і складаных назоўнікаў, утвораных пры дапамозе злучальных галосных: *мотагурток, агратурызм; кнігадрукаванне, снегаачыстка*.

Адметна, што, аналізуючы працу ўдзельнікаў тэсціравання над заданнем А10, мы ўбачылі зусім іншую карціну: 25% абітурыентаў дапусцілі памылкі пры напісанні прыметнікаў накшталт *авіярамонтны, гідратэхнічны* з аналагічнымі іншамоўнымі часткамі (*авія-, гідра-, метэа-* і пад.). Атрымліваецца, што адрозненне ў напісанні няма (і назоўнікі, і прыметнікі з указанымі часткамі пішуцца разам), а розніца ў выніках істотная. На якім этапе і па якіх прычынах адбыўся «збой» у асэнсаванні моўнага матэрыялу і ў развагах шматлікіх паступаючых, дакладна сказаць цяжка. Зразумела толькі тое, што некаторыя з іх усё ж не былі ўпэўнены ў сваіх ведах.

Даволі часта парушэнне літаратурных нормаў сучаснай беларускай мовы звязана з памылковым правапісам, скланеннем ці ўжываннем лічэбнікаў. Хто з нас хоць раз не чуў замест правільнага скланення састаўнога парадкавага лічэбніка тыпу *ў «дзве тысячы пятым» годзе* няправільнае *ў «двухтысячна пятым» годзе*? Кожнаму неаднойчы даводзілася запісваць лікі словамі, і поспех у гэтым выпадку залежаў толькі ад наяўнасці «пад рукой» дакладных ведаў пра лічэбнік.

Выконваючы заданне А11, 37% паступаючых дапусцілі памылкі пры напісанні колькасных складаных лічэбнікаў *пяцьдзясят — восемдзесят*; 20% не знайшлі памылак у лічэбніках тыпу *адзінадцаць, дваццаць*;

# дзе веды

29% абітурыентаў не ведалі правапісу колькасных дробавых лічэбнікаў з першымі часткамі *дзве, тры, чатыры: дзве пятыя, тры чацвёртыя, чатыры сёмыя*; 20% выбралі як правільна напісаныя парадкавыя лічэбнікі тыпу *трэцій, чацвёртый, пятый, сёмый, восьмый, дзявятый, дзясятый,* якія ў беларускай мове маюць канчаткі *-ы* або *-і*: *трэці, чацвёрты, пяты, сёмы, восьмы, дзявяты, дзясяты*; 38% не адзначылі як правільныя колькасныя зборныя лічэбнікі тыпу *пяцёра, сямёра*.

І яшчэ адно назіранне: памылкі некаторымі абітурыентамі маглі быць дапушчаны пад уплывам правапісу рускай мовы (параўнаем у рускай мове: *восемьдесят, двадцать, три пятых, пятый, пятеро*). Значыць, падчас навучання ва ўстановах адукацыі лічэбнікі патрабуюць максімальнай увагі і засяроджанасці.

З заданнем А12 на правапіс канчаткаў дзеясловы не справіліся каля 55% паступаючых, якія або няправільна вызначылі спражэнне дзеясловаў, або не суаднеслі дзеясловы I, II спражэнняў з трываннем. Як, напрыклад, абітурыенты, якія выконвалі 7-ы варыянт тэста: 30% з іх утварылі форму 1-й асобы множнага ліку будучага простага часу не ад зваротнага дзеяслова закончанага трывання (*што зрабіць?*) *разлічыцца — мы* (*што зробім?*) *разлічымся*, а ад зваротнага дзеяслова незакончанага трывання (*што рабіць?*) *разлічвацца — мы (што робім?) разлічваемся*.

Невысокі працэнт паспяховасці выканання задання А13 удзельнікамі тэсціравання тлумачыцца недакладным марфалагічным веданнем правапісу прыслоўяў, спосабаў іх утварэння і недастаткова сфарміраваным у выпускнікоў марфалагічным уменнем адрозніваць прыслоўі ад іншых часцін мовы. Характар і працэнт памылак, дапушчаных усімі абітурыентамі, наступныя: 17% не засвоілі правіл напісання разам прыслоўяў з першай часткай *што-* (*штораніцы*); 23% не завучылі правіл напісання праз злучок прыслоўяў з прыстаўкай *абы- (абы-адкуль)*; 30% няправільна напісалі разам блізкія да прыслоўяў па значэнні і функцыі спалучэнні назоўнікаў з прыназоўнікамі (*да смаку*); 23% не распазналі прыслоўяў, якія ўтвораны ад іншых прыслоўяў прыставачным спосабам (*назаўсёды*); 18% не ведалі, што прыслоўі, якія маюць прыстаўку *па-* і заканчваюцца на *-аму, -яму,* пішуцца праз злучок (*па-новаму*).

Заданне А14 традыцыйна правярала ўменне адрозніваць часціцы *не, ні* і прыстаўкі *не-, ні-,* веданне правіл напісання іх асобна ці, адпаведна, разам з рознымі часцінамі мовы. Як сведчаць вынікі тэсціравання, 28% абітурыентаў няправільна напісалі разам часціцу *не* з дзеепрыслоўямі (*не скараціўшы*); 29% — з кароткімі дзеепрыметнікамі (*тэксты не надрукаваны*); 20% — з прыметнікамі пры наяўнасці супрацьпастаўлення (правільна: *не маўклівы, а гаваркі юнак*). Амаль 27% дапусцілі памылкі, адзначыўшы, што поўныя дзеепрыметнікі пры адсутнасці залежных ад іх слоў пішуцца з *не-* асобна (*неперакладзеная аповесць*); 15% — напісаўшы *не-* асобна з няпэўнымі займеннікамі і неазначальнымі прыслоўямі (*нечым зацікавіў, неяк дапамог*).

Выконваючы заданне А15, ад 80% да 90% удзельнікаў ЦТ-2021 пацвердзілі веданне правіл ужывання часціцы *не* для надання сцвярджэння сказу пытальна-клічнага тыпу (*Якімі толькі фарбамі не радаваў нас май!*), пры дзеяслове-выказніку для надання адмоўнага значэння сказу (*Без хлеба калісьці не елі ніводнай стравы.*), пры кожнай часціцы састаўнога дзеяслоўнага выказніка для надання сказу сцвярджальнага сэнсу (*Не магу не ганарыцца нашымі славутымі продкамі.*), правіл ужывання часціцы *ні* ў спалучэнні *ні разу* са значэннем *'ніколі'* (*Парадаю бацькоў ні разу я не пагарджаў.*).

Як мінімум тры гады запар да 30% абітурыентаў няправільна ўжываюць адмоўную часціцу *не* ў складаных сказах, дзе ў даданай частцы для ўзмацнення сцвярджэння патрабуецца часціца *ні* (*Куды б ні глянуў, усё здзіўляе: з'яўленне зор і сонца ў вышыні, з'яўленне соку з глыбіні карэння, з'яўленне траўкі ў веснавыя дні.*).

У аснове памылак, дапушчаных некаторымі ўдзельнікамі тэсціравання пры выкананні задання В2, ляжыць неразуменне імі самой з'явы «злучнік», адсутнасць умення вызначаць часціну мовы, якая ўдзельнічае ў сувязі частак складаназалежных сказаў, навыку размяжоўваць службовыя і самастойныя часціны мовы.

Між тым уменне адрозніваць займеннікі ад злучнікаў фарміруецца ў 6 класе падчас вывучэння тэмы «Займеннік як самастойная часціна мовы», у 9-м — тэмы «Складаназалежныя сказы». І гэта без уліку гадзін, адведзеных на паўтарэнне гэтых тэм у 10 і 11 класах. Значыць, прабелы, адсутнасць адпаведных тэарэтычных ведаў і практычных уменняў у абітурыентаў неапраўданыя. Справа тут не ў лакунах, якія маглі быць абумоўлены нязначнай колькасцю вучэбнага матэрыялу. Абітурыенты, відаць, самі адмовілі сабе ў веданні тэмы.

У дыяпазоне ад 66 да 81 знаходзіцца працэнт выканання задання В3 на вызначэнне канчаткаў назоўнікаў 3-га скланення выпускнікамі школ, гімназій, ліцэяў. Прычыны, па якіх былі дапушчаны памылкі, абсалютна аднолькавыя ў выпускнікоў усіх устаноў адукацыі.

Адна з іх — няведанне склонавых пытанняў: многія блыталі пытанні творнага (*кім? чым?*) і роднага (*каго? чаго?*), а хутчэй меснага (*аб кім? аб чым?*) склонаў. Адсюль памылковыя адказы тыпу *мудрасці, радасці, адказнасці* (трэба: *мудрасцю, радасцю, адказнасцю*).

Другая прычына — няведанне правапісу назоўнікаў 3-га скланення ў форме творнага склону адзіночнага ліку ці (і) правапісу падоўжаных зычных. Значная частка абітурыентаў няправільна напісала ў творным склоне назоўнікі з дзвюма літарамі *ц*: *мудрасццю, радасццю, адказнасццю*.

А вось адказы накшталт *мудрасцью, радасцью, адказнасцью,* між іншым, маглі быць дадзены пад уплывам рускай мовы. Параўнайце ў рускай мове: *мудростью, радостью, ответственностью*.

Сярод памылак, якія былі дапушчаны ўдзельнікамі ЦТ у заданні В4, асноўная — гэта ўтварэнне не вышэйшай, а найвышэйшай ступені параўнання прыметнікаў: *прыгожы — найпрыгажэйшы* (правільна: *прыгажэйшы*), *поўны — найпаўнейшы* (правільна: *паўнейшы*), *шчаслівы — найшчаслівейшы* (правільна: *шчаслівейшы*) і г.д.

Некаторыя паступаючыя не змаглі абсалютна правільна выканаць заданне В4, бо пры запісе адказу дапусцілі тую ці іншую памылку. Скажам, 60 чалавек, утварыўшы ў 1-м варыянце неабходную простую форму вышэйшай ступені параўнання прыметніка *чысты — чысцейшы*, запісалі адказ з арфаграфічнай памылкай — *чыстейшы*.

Чаго не ведалі і чаго не ўлічылі (заданне В5) сёлетнія абітурыенты, змяняючы займеннікі? Не ведалі канчаткаў азначальных, указальных і прыналежных займеннікаў у форме назоўнага склону множнага ліку. Не ўлічылі, што іх канчаткі ў беларускай і рускай мовах розныя. Сярод адказаў удзельнікаў тэсціравання даволі шмат такіх, як *усякіе, сваі, самые* (правільна: *усякія, свае, самыя*). Параўнайце ў рускай мове: *всякие, свои, самые*.

Тэма «Дзеепрыслоўі незакончанага і закончанага трыванняў, іх утварэнне і правапіс» не выклікала цяжкасцей у больш чым 70% выпускнікоў гімназій, ліцэяў і ў 56% выпускнікоў школ. Узровень складанасці задання В6 для навучэнцаў УССА, УПТА і тых, хто закончыў установы адукацыі раней, атрымаўся высокім. Аналіз адказаў тых абітурыентаў, хто памыліўся, паказаў, што многія зусім не валодалі паняццем *дзеепрыслоўе*. Яны праігнаравалі практычна ўсе характарыстыкі гэтай асобай дзеяслоўнай формы. Адказы шматлікіх паступаючых нават і прыблізна не суадносіліся з пастаўленай у заданні задачай. Так, напрыклад, некаторыя з іх утварылі ад асновы цяперашняга часу дзеяслова *адчуваюць* не дзеепрыслоўе, а дзеяслоў *адчуваць* ці назоўнік *адчуванне* і г.д.

## Сінтаксіс і пунктуацыя

Кожны год у тэставае заданне А16 уключаюцца сінтаксічныя канструкцыі, за якімі стаіць свая гісторыя. На аснове прыкладу з 7-га варыянта тэста абазначым сінтаксічныя канструкцыі, вядомыя большай і меншай колькасці ўдзельнікаў ЦТ-2021. Колькасць адказаў у працэнтных адносінах пазначым насупраць кожнай опцыі.

**А16.** Адзначце сінтаксічныя канструкцыі, якія адпавядаюць нормам беларускай літаратурнай мовы:

1) вышэй сястры (23,06);
2) жыць у суседстве (50,07);
3) пайсці за хлебам (51,07);
4) вялікая накіп (34,57);
5) разважаць пра будучае (70,10).

***Адказ: 2,5.***

З прыведзенага прыкладу вынікае, што 23% з тых паступаючых, хто выконваў 7-ы варыянт (1726 чалавек), слаба засвоілі правіла ўжывання пры прыслоўі ў форме вышэйшай ступені параўнання назоўніка ў форме вінавальнага склону з прыназоўнікам *за*. *Вышэй за сястру* — такі будзе правільны адказ. Увогуле, як паказаў аналіз адказаў на заданне А16 ва ўсіх 10 варыянтах тэста, гэтага правіла не засвоілі 26% абітурыентаў. Веданне характэрнай для сучаснай беларускай літаратурнай мовы сінтаксічнай канструкцыі *жыць у суседстве* (для параўнання ў рускай мове: *жить по соседству*) пацвердзілі 50% з 1726 чалавек. А ў цэлым падобныя сінтаксічныя адзінкі (*прыехаць іншым разам, вызначыць на смак, убачыць на свае вочы, пазбавіцца недахопаў, на свой густ* і інш.) не засталіся па-за ўвагай 66% паступаючых. Таго, што дзеясловы са значэннем руху пры абазначэнні мэты дзеяння кіруюць у беларускай мове назоўнікамі ў форме вінавальнага склону з прыназоўнікам *па*, не ведалі 40% удзельнікаў тэсціравання. Калі гаварыць пра 7-ы варыянт, то іх, мы бачым, 51%. Яны ўзялі за правільны адказ словазлучэнне *пайсці за хлебам*. Трэба: *пайсці па хлеб*. Каля 35% абітурыентаў, якія працавалі з 7-м варыянтам, не засвоілі назоўнікаў, род якіх у беларускай і рускай мовах не супадае. З усіх удзельнікаў ЦТ-2021 30% пазначылі няправільныя сінтаксічныя канструкцыі тыпу *разборлівая подпіс, залатая медаль, лёгкая поступ* (трэба: *разборлівы подпіс, залаты медаль, лёгкі поступ*) як адпаведныя нормам. Дзеясловы са значэннем думкі, маўлення, пачуцця спалучаюцца ў беларускай мове з назоўнікамі (займеннікамі) у форме вінавальнага склону з прыназоўнікам *пра*. Валодалі гэтым вучэбным матэрыялам 70% паступаючых, якія выконвалі 7-ы варыянт, і 74% ад усіх абітурыентаў 2021 года.

Выдзеленыя ў заданні А17 дзеепрыметнікавыя звароты (*Зіхацяць асеннія сцяжынкі,* ***знітаваныя празрыстай павуцінкай****.*) правільна адзначылі як азначэнне 68% абітурыентаў. Амаль 67% паступаючых не аднеслі адносных займеннікаў *які* (*якое, якая, якія*) да азначэння і не памыліліся. Адказна паставіліся да вывучэння спосабаў выражэння дзейніка і сінтаксічна несвабодных словазлучэнняў у 8-м класе 63% іспытуемых.

Два аднасастаўныя і тры двухсастаўныя сказы склалі заданне А18. Перад абітурыентамі ставілася задача адзначыць аднасастаўныя. Каля 32% памыліліся і не сталі адносіць да аднасастаўных няпэўна-асабовыя сказы (*Упершыню Полацк узгадваюць у «Аповесці мінулых гадоў».*), 31% — безасабовыя сказы (*У восеньскім садзе пахла антонаўкамі.*). Прыкладна 40% няправільна вызначылі як аднасастаўныя тыя сказы, у якіх дзейнік выражаны назоўнікам, выказнік — прыметнікам (*Паветра пасля навальніцы чыстае.*); 27% — сказы, у якіх дзейнік выражаны субстантываваным прыметнікам, выказнік — дзеясловам (*Малое часта заслугоўвае вялікай увагі.*). Што асабліва здзіўляе, дык гэта прызнанне даволі вялікай часткай абітурыентаў (30%) сказаў з дзейнікам, выражаным назоўнікам, і выказнікам, выражаным дзеясловам (*Апетыт прыходзіць у час яды.*), аднасастаўнымі.

Матэрыялам дзесяці заданняў правяралася ступень тэарэтычнага асэнсавання сістэмы пунктуацыі беларускай мовы і навыкі, звязаныя з уменнем расстаўляць знакі прыпынку розных тыпаў у канкрэтных сінтаксічных канструкцыях. Адной з першых пунктуацыйных сітуацый, якая была прапанавана абітурыентам у тэсце, — гэта вызначыць сказы, дзе абавязкова ставіцца працяжнік паміж дзейнікам і выказнікам (заданне А19). Практычна 20% удзельнікаў ЦТ-2021 палічылі не толькі правільнай, але і абавязковай пастаноўку працяжніка паміж дзейнікам, выражаным займеннікам, і выказнікам, выражаным назоўнікам у форме назоўнага склону (*Люблю жнівень за тое, што ён самы хлебны месяц.*). Недзе 35% абітурыентаў памыліліся, адзначыўшы, што паміж дзейнікам і выказнікам, выражанымі назоўнікамі ў форме назоўнага склону, пры наяўнасці адмоўнай часціцы *не* трэба абавязкова паставіць працяжнік (*Слова не доктар, але яно часта лечыць.*). Традыцыйна абсалютная большасць паступаючых (і бягучы год не выключэнне) добра засвойвае правілы пастаноўкі працяжніка паміж дзейнікам, выражаным інфінітывам, і выказнікам, выражаным назоўнікам у форме назоўнага склону (*Плыць на лодачцы па ціхай рэчцы — сапраўднае шчасце.*); паміж дзейнікам і выказнікам, выражанымі назоўнікамі ў форме назоўнага склону (*Лес — змястоўная кніга.*).

Умовы, пры якіх аднародныя члены сказа раздзяляюцца (не раздзяляюцца) коскамі, ведала менш за палову абітурыентаў 2021 года (заданне А20). Цяжкасці ў асноўнай часткі паступаючых выклікалі сказы з фразеалагізмамі (*Ні кала ні двара не бывае ў гультая.*) і сказы з аднароднымі членамі, звязанымі паўторным спалучальным злучнікам *і* (*Наша мова звонкая, іскрыстая, і мяккая, і паэтычная.*). Да 50% абітурыентаў няправільна адзначылі, што коска паміж словамі ў складзе фразеалагізмаў адпавядае пунктуацыйным нормам беларускай літаратурнай мовы; 55% не ведалі пра пастаноўку коскі паміж усімі аднароднымі членамі сказа, звязанымі паўторным спалучальным злучнікам *і*.

Пунктуацыйная сітуацыя, прапанаваная ў заданні А21, патрабавала наяўнасці навыку вызначаць сярод сінтаксічных канструкцый параўнальныя звароты, што выдзяляюцца (аддзяляюцца) коскамі (коскай). Такія звароты правільна адмаркіравалі ў кожным варыянце тэста ад 70% да 80% паступаючых. Аднак пры гэтым 20% абітурыентаў памыліліся, аддзяліўшы коскамі выказнікі (*Зімой, вясною, восенню і летам лес нібы казка.*) і звароты са значэннем *'у якасці'* (*Ільняныя вырабы выступаюць* ***як своеасаблівая візітная картка Беларусі****.*).

Сінтаксічна-пунктуацыйным кантролем у заданні А22 былі ахоплены адасобленыя члены сказа. Памылкі абітурыентаў у асноўным (да 25%) абумоўлены парушэннем пунктуацыйных нормаў у сказах з дзеепрыслоўнымі зваротамі (***Гледзячы на слуцкія паясы****, міжволі ўзгадваеш расяны луг, што пад першымі сонечнымі промнямі пераліваецца ўсімі колерамі вясёлкі.*), з дзеепрыметнікавымі зваротамі ў пазіцыі перад паяснёнымі назоўнікамі (*Лепш за ўсё ў Ляўках восенню, калі чаруе звон* ***кранутых золатам*** *лясоў.*). Адасобленыя прыдаткі, якія даюць прадмету другую назву і пры якіх ёсць злучнік *ці*, правільна выдзелілі 80% паступаючых (*Зверабой,* ***ці інакш святаяннік****, з'яўляецца лекавай раслінай.*). Хоць яшчэ некалькі гадоў назад амаль 50% абітурыентаў дапускалі памылкі ў сказах з такімі сінтаксічнымі адзінкамі.

Ступень валодання абітурыентамі катэгорыяй пабочнасці і паняццем 'устаўныя канструкцыі' была аб'ектам кантролю ў заданні А23. Дзесьці 30% удзельнікаў ЦТ не змаглі адрозніць у сказах пабочныя канструкцыі (*Прымяненне літары «й» садзейнічала,* ***вядома****, удасканаленню старабеларускай графічнай сістэмы. Не ўсе кветкі,* ***скажам шчыра****, вяжуць у букеты.*) і ўстаўныя сказы (*Лён* ***(я сам у гэтым шмат разоў пераконваўся)*** *мае статус своеасаблівай візітнай карткі Беларусі.*). У той жа час 24% абітурыентаў назвалі пабочным слова *нават* (*Везла восень пэндзлікі ў павозцы, малявала лісце* ***нават*** *на малой бярозцы.*), якое такім ніколі не з'яўляецца.

Колькасна-змястоўны аналіз адказаў абітурыентаў на заданне А24 па тэме «Знакі прыпынку паміж часткамі ў складаназлучаных сказах» паказаў наступнае: ніякіх цяжкасцей у 90% паступаючых не выклікалі складаназлучаныя сказы, у якіх часткі з супрацьлеглым (супастаўляльным) значэннем звязаны пры дапамозе супраціўнага злучніка *а* (*Кветка без плода — гэта пустацвет****,*** *а праца без асалоды — гэта пусты мех.*) і дзе часткі з размеркавальнымі сэнсавымі адносінамі звязаны паўторным размеркавальным злучнікам *то — то* (*То квітнеючым садам пахне ў маі дождж****,*** *то ён водарам кветак палявых напоўнены.*). Амаль 80% абітурыентаў засвоілі, што знакі прыпынку не ставяцца паміж часткамі складаназлучаных сказаў,

►►► 12 стар.

# Поспех там, дзе веды



*Маладыя гады,*
*Маладыя жаданні!*
*Ні жуды, ні нуды,*
*Толькі шчасце кахання!*

*Помніш толькі красу,*
*Мілы тварык дзявочы,*
*Залатую касу,*
*Сіняватыя вочы!*

*Цёмны сад-вінаград,*
*Цвет бяленькі вішнёвы, —*
*І агністы пагляд,*
*І гарачыя словы!*

*Будзь жа, век малады,*
*Поўны светлымі днямі!*
*Пралятайце, гады,*
*Залатымі агнямі!*

9 снежня спаўняецца 130 гадоў з дня нараджэння нашага класіка Максіма Багдановіча. Сябры, вывучайце беларускую мову, каб наталяцца высокай паэзіяй любімых паэтаў.

◄◄◄ 11 стар.

якія маюць спалучальныя сэнсавыя адносіны, звязаны адзіночным спалучальным злучнікам *і*, а ў першай частцы ёсць агульныя для іх словы (***Ужо звечара*** *купае неба зоры ў ледзяной вадзе і месяц срэбрам сцежку торыць, кудысьці ідзе-брыдзе.*). Столькі ж паступаючых (80%) ведалі, што паміж часткамі складаназлучанага сказа, якія маюць пытальна-клічную інтанацыю, перад адзіночным спалучальным злучнікам *і* коска не ставіцца (*Як прыгожа чырванее рабіна і якія дзівосныя просяцца ў вярэньку журавіны! Ці ж бывае ручай без вадзіцы і ці ж сустракаецца луг без медуніцы?*). Не адпавядалі сінтаксічным нормам адказы 62% тых абітурыентаў, хто адзначыў, што паміж часткамі складаназлучаных сказаў са спалучальнымі сэнсавымі адносінамі перад спалучальным злучнікам *і* знакі прыпынку не ставяцца (*Івалгі аспрэчвалі ў чырванагрудых заранак першынство па мастацкім свісце**,** і жаваранкі не ўступалі па спевах чарнапёрым драздам.*).

Матэрыялам тэставага задання А25 правяралася ступень валодання пунктуацыйнымі нормамі, якія вызначаны для складаназалежных сказаў. Прааналізаваўшы работу абітурыентаў над матэрыялам задання, з вялікай доляй упэўненасці даводзіцца канстатаваць: у аснове памылак часам ляжаць не толькі прабелы ў ведах, але і звычайная няўважлівасць. Так, даволі значны працэнт абітурыентаў не пацвердзіў парушэння пунктуацыйных нормаў у складаназалежных сказах, дзе дадзеная частка ў сярэдзіне галоўнай была выдзелена толькі з аднаго боку: *Сны, у якіх да нас прыходзіць маленства самыя прыгожыя, самыя светлыя.* Дадзеная частка ў адпаведнасці з правіламі пунктуацыі выдзяляецца коскамі з двух бакоў: *Сны**,** у якіх да нас прыходзіць маленства**,** самыя прыгожыя, самыя светлыя.*

Фармальны падыход да правядзення сінтаксічнага аналізу сказа і адсутнасць дакладнага ведання правіл пастаноўкі знакаў прыпынку паміж часткамі бяззлучнікавых складаных сказаў не дазваляюць на кожным ЦТ пэўнай частцы абітурыентаў справіцца з моўным матэрыялам задання А26. Абазначым лік паступаючых, якія ў бягучым годзе не вызначылі колькасці частак у бяззлучнікавых складаных сказах, сэнсавых адносін паміж імі і (ці) не ведалі ўмоў пастаноўкі двукроп'я, працяжніка, коскі: 28% не ўстанавілі ў адным з 5 прапанаваных сказаў тыпу *Лес шуміць без ветру, шкло ў вокнах пацее — быць дажджу*. трох сэнсавых частак і адзначылі, што ён адпавядае схеме **[ ] — [ ].**; 35% паставілі працяжнік на месцы патрэбнага двукроп'я (*Літаратурныя творы Якуба Коласа нездарма лічацца найлепшымі пейзажнымі творамі**:** мастацкім словам пісьменнік перадаў прыроду ва ўсім багацці яе фарбаў, гукаў і рухаў.*); 27% паставілі працяжнік на месцы неабходнай коскі (*Купаецца ў рацэ празрыстай сонца**,** гудуць над кветкамі духмянымі чмялі.*); 26% не паставілі працяжніка паміж часткамі, змест якіх супрацьпастаўляецца і дзе другая частка паказвае на вынік таго, пра што гаворыцца ў першай, або першая частка паказвае на ўмову таго, пра што гаворыцца ў другой (*Гукнула некага ўначы сава **—** ніхто не адазваўся. Сонца ў хмарку садзіцца **—** чакай заўтра навальніцы.*).

У заданні А27 традыцыйна правяралася веданне правіл пастаноўкі знакаў прыпынку ў складаных сказах з рознымі відамі сувязі частак. Прывядзём прыклад задання з 7-га варыянта тэста.

**А27.** Адзначце нумары пропускаў, на месцы якіх у складаным сказе з рознымі відамі сувязі частак трэба паставіць коску:

*Сакавік — гэта месяц*$_{1)}$___ *калі сыходзяцца зіма і вясна*$_{2)}$___ *і калі надвор'е мяняецца некалькі разоў на працягу аднаго дня*$_{3)}$___ *зранку выглядвае сонейка*$_{4)}$___ *сваім цяплом якое на нейкі час абнадзейвае ўсё жывое*$_{5)}$___ *а ў абед ці пад вечар пачынае дзьмуць халодны вецер, ісці дождж альбо снег.*

***Адказ: 1,4,5.***

У гэтым сказе знакі прыпынку павінны быць пастаўлены наступным чынам: *Сакавік — гэта месяц**,** калі сыходзяцца зіма і вясна і калі надвор'е мяняецца некалькі разоў на працягу аднаго дня**:** зранку выглядвае сонейка**,** сваім цяплом якое на нейкі час абнадзейвае ўсё жывое**,** а ў абед ці пад вечар пачынае дзьмуць халодны вецер, ісці дождж альбо снег.*

Правёўшы структурна-семантычны і пунктуацыйны разбор падобных складаных сінтаксічных канструкцый, абсалютна правільны адказ далі 45% абітурыентаў. У аснове памылак, якія былі дапушчаны 56% выпускнікоў усіх устаноў адукацыі на этапе кваліфікацыі пунктаграмы, ляжыць слабае засваенне правіл пастаноўкі знакаў прыпынку паміж часткамі, звязанымі бяззлучнікавай сувяззю, і паміж аднароднымі дадзенымі часткамі, звязанымі адзіночным спалучальным злучнікам *і*.

Выкананне задання А28 на праверку ведання спосабаў афармлення простай мовы, якая стаіць пасля слоў аўтара, не прадугледжвала сур'ёзных мысліцельных аперацый. Абітурыентам не трэба было вызначаць месца простай мовы ў дачыненні да слоў аўтара, ім падаваліся знакі прыпынку, неабходныя для прыведзенай у сказе сітуацыі. Акрамя таго, прапанаваная пунктуацыйная сітуацыя запатрабавана на працягу ўсяго курса навучання ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі. Для нагляднасці прывядзём прыклад задання з 8-га варыянта экзаменацыйнай работы і колькасць адказаў у працэнтных адносінах насупраць кожнай опцыі.

> ***Маўленне — гэта візітоўка чалавека. Першае ўражанне пра кожнага з нас складваецца не толькі на аснове ўспрымання нашай знешнасці, адзення, манеры паводзін, але і дзякуючы таму, як мы ўмеем выказваць свае думкі і пачуцці. Адносіцца нядбайна да сваёй моўнай рэпутацыі, лічыць мову другаснай з'явай — значыць аўтаматычна станавіцца шмат у чым некампетэнтным.***

**А28.** Адзначце прапушчаныя ў сказе з простай мовай знакі прыпынку:

*«У зімовы час бабры харчуюцца нарыхтаванай восенню карой дрэў" — адказаў на пытанне дзяцей біёлаг.*

1) коска (81,58);
2) двукроп'е (9,45);
3) працяжнік (5,23);
4) пытальнік (2,85);
5) кропка (83,36).

***Адказ: 1,5.***

Дапушчаныя нешматлікімі абітурыентамі памылкі пры афармленні простай мовы, як і ў заданні А25, можна растлумачыць не толькі прабеламі ў ведах, але і звычайнай няўважлівасцю. Некаторыя паступаючыя абыякава паставіліся да ўмовы задання, у якой акцэнтавана ўвага на адсутнасці ў сказе не аднаго, а некалькіх знакаў прыпынку.

## Маўленне. Тэкст. Стылістыка

Заданне А29 правярала ўменні і навыкі аналізаваць сэнсавую структуру тэкстаў навуковага, мастацкага і публіцыстычнага стыляў. Адкрыем спіс тэарэтычных ведаў, якімі павінны былі валодаць удзельнікі ЦТ-2021, каб паспяхова яго выканаць: беларуская літаратурная мова развіваецца ў вуснай і пісьмовай разнавіднасцях, у адпаведнасці з чым вуснай мове належыць гутарковы стыль, а пісьмовай — кніжныя стылі: мастацкі, навуковы, публіцыстычны і афіцыйны; у некаторых стылях шырока выкарыстоўваюцца моўныя сродкі іншых стыляў маўлення, аднак тэкст кожнага стылю валодае прыкметамі, якія характэрны ў большай ступені яму, а не іншаму.

Безумоўна, гэты спіс не закрыты, але яго дакладнае веданне можа дапамагчы правільна вызначыць, напрыклад, мастацкі стыль, не зблытаўшы яго з гутарковым ці публіцыстычным.

З заданнем А29 сёлета справіліся 67% абітурыентаў. Статыстычныя паказчыкі яго выканання і ў мінулыя гады, і ў бягучым годзе падводзяць да высновы, што ў працэсе навучання найбольшы акцэнт трэба рабіць на працы з тэкстамі публіцыстычнага стылю. У бягучым годзе правільна ідэнтыфікавалі тэксты мастацкага стылю 80% паступаючых, навуковага стылю — 77%, публіцыстычнага стылю — 59%.

Заданне А30 выяўляла ступень валодання марфалагічнымі і арфаграфічнымі нормамі сучаснай беларускай мовы. Удзельнікам тэсціравання неабходна было пазбегнуць памылак, звязаных з ужываннем займеннікаў і прыслоўяў, з вызначэннем канчаткаў назоўнікаў, прыметнікаў і суфіксаў дзеясловаў. Нормамі, што належаць да абавязковага вывучэння ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі, валодалі 41% паступаючых. Як паказаў аналіз, да істотнага зніжэння паспяховасці выканання задання ў першую чаргу прывяло недастатковае веданне абітурыентамі правапісу дзеясловаў з суфіксамі *-ыва-* (*-іва-*).

Наўрад ці хто стане спрачацца з тым, як важна валодаць лексічным багаццем мовы, уменнем бачыць унікальнасць слоў, дакладна выказваць свае думкі. Не менш важна ведаць законы спалучальнасці слоў, бо ў вусным ці пісьмовым маўленні мы нярэдка сустракаемся з выказваннямі граматычна правільнымі, аднак семантычна анамальнымі. Словы не могуць адвольна складвацца ў словазлучэнні. Іх адвольнаму спалучэнню перашкаджае шмат абмежаванняў на спалучальнасць. Навошта, скажам, ставіць побач два словы, значэнне аднаго з якіх уваходзіць у тлумачэнне другога. Размова ідзе пра плеаназмы, прапанаваныя ўдзельнікам тэсціравання для ідэнтыфікацыі ў заданні В1. Напрыклад:

**В1.** Знайдзіце ў ***13-м*** сказе тэксту немэтазгодна (збыткоўна) выкарыстанае слова, якое парушае правільнасць маўлення. Запішыце гэта слова ў той граматычнай форме, у якой яно пададзена ў ***13-м*** сказе.

(13) *Вось і цяпер яна пачала збіраць самыя прыгожыя з іх у букет, які паставіць у вазу, каб пахучым водарам напоўніўся кожны пакой у хаце.*

***Адказ: пахучым.***

З ліку паступаючых, якія выконвалі 10-ы варыянт тэста, 44% ведалі лексічнае значэнне слоў *пахучы* (*які мае прыемны пах; духмяны*) і *водар* (*прыемны пах; духмянасць*), правілы спалучальнасці слоў і далі правільны адказ: у словазлучэнні *пахучым водарам* слова *пахучым* збыткоўнае (плеаназм).

## Шаноўныя абітурыенты 2022 года!

Мы падалі найбольш актуальныя звесткі пра ЦТ-2021 года па беларускай мове з акцэнтам на тыповых памылках. Спадзяёмся, што для вас гэты матэрыял будзе карысным. Ацаніць сённяшні ўзровень сваіх ведаў па прадмеце і вызначыць для сябе эфектыўныя шляхі далейшай падрыхтоўкі вы зможаце, прыняўшы ўдзел у трох этапах рэпетыцыйнага тэсціравання, у тым ліку ў рэжыме анлайн.

***РІКВ жадае поспеху ўсім абітурыентам 2022 года!***

**Матэрыял прадастаўлены Рэспубліканскім інстытутам кантролю ведаў.**
**Фота Алега ІГНАТОВІЧА.**